*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
***ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ.***



# Наша СЛОВА.pdf

**Пяты год выдання** **№ 18 (227) 6 траўня 2026 г.**

# З Днём Перамогі, Беларусь!



## Юр’е ў Беліцы

Юр’е для Беліцы - храмавае свята. Менавіта тут знаходзіцца касцёл Святога Юр’я. 3 траўня ў мястэчку ладзілася фальклорнае свята "Юр'еўскі карагод".

Свята атрымалася такое, што і сонца, здаецца, спецыяльна выглянула паглядзець! Было ўсё, як мае быць: і юр'еўскія песні - душа аж разварочваецца, і карагоды - ногі самі ў скокі ідуць, і нават пастухоў ушанавалі, каб год быў багаты ды ўдалы.




А яечня! Ох, тая самая, рытуальная - не проста страва, а сапраўдны смак дзяцінства і традыцый. Хто паспрабаваў - той ведае.









І, канешне, канцэрт - нашы фальклорныя калектывы далі такую энергетыку, што самыя сур'ёзныя пачалі ўсміхацца і падпяваць.

Калі шчыра, такія святы - гэта не толькі пра традыцыі. Гэта пра нас з вамі: пра сустрэчы, жарты, цеплыню і тое самае адчуванне, калі "свае людзі" побач.

Дзякуй усім, хто быў разам - вы стварылі гэты настрой!

***ТК “Культура Лідчыны”.***

# Творчы экзаменацыйны марафон

У Палацы культуры горада Ліды прайшоў марафон выступленняў калектываў Лідскага раёна на пацверджанне званняў "Народны" і "Узорны"!

Першай на сцэну выйшла ўзорная студыя эстраднай песні "Дамінанта" ДУА "Гімназія №1 г. Ліды", кіраўнік - Піваварчык Галіна Андрэеўна. Дзеці запалілі залу сваёй энергіяй!







Творчы іспыт працягнуў "Народны ансамбль народнай музыкі "Гудскі гармонік" (філіял "Гудскі цэнтр творчасці і вольнага часу" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"). Кіраўнік - Андрэй Антонавіч Колышка.

Выступленне гэтага калектыва - гэта заўсёды сапраўднае свята народнай музыкі! Забіяцкія мелодыі, майстэрскае валоданне інструментамі і невычэрпная энергія артыстаў не пакінулі абыякавымі ні гледачоў, ні экспертную камісію. "Гудскі гармонік" працягвае слаўныя традыцыі музычнай спадчыны Лідчыны, зараджаючы ўсіх вакол выдатным настроем!









# Творчы экзаменацыйны марафон

Эстафету выступаў на пацверджанне звання "Народны" прыняў Народны ансамбль побытавых інструментаў "Каханачка" (філіял "Мажэйкаўскі клуб-бібліятэка" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"). Кіраўнік калектыва - Людміла Уладзіславаўна Масевіч.

"Каханачка" - гэта заўсёды самабытнасць, шчырасць і дзіўнае гучанне звыклых рэчаў, якія ў руках майстроў ператвараюцца ў сапраўдныя музычныя прылады. Калектыў клапатліва захоўвае традыцыі і кожны раз дзівіць гледачоў сваім каларытам і запалам!









На сцэне Палаца культуры горада Ліды ў рамках пацверджання звання "Народны" выступіў "Народны сямейны ансамбль Парфенчыкаў" (філіял "Бердаўскі культурна-досугавы цэнтр" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"). Кіраўнік - Аляксандр Генадзевіч Парфенчык.

Сямейная творчасць заўсёды валодае адмысловай сілай і шчырасцю. Ансамбль Парфенчыкаў - гэта яркі прыклад таго, як любоў да музыкі аб'ядноўвае пакаленні, беражна захоўваючы культурную спадчыну нашага краю. Выступленне калектыва стала сапраўдным упрыгожваннем дня!








# Творчы экзаменацыйны марафон

Творчую эстафету падхапіў Народны вакальны ансамбль "Святліца" (філіял "Дзітвянскага Дома культуры" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"). Кіраўнік - Таццяна Мар’янаўна Каплун.

"Святліца" зноў пацвердзіла, што песня - гэта жывая нітка, якая злучае пакаленні. Чыстыя галасы, суладнае гучанне і шчырасць выканання скарылі залу. Кожны выступ ансамбля напоўнены глыбокай любоўю да народнай песні і родных вытокаў. Брава артыстам за майстэрства і захаванне песенных традыцый! Беражна захоўваемы культурную спадчыну!








У другі дзень творчага іспыту ў Палацы культуры горада Ліды працягваліся агляды на пацверджанне ганаровых найменняў "Народны" і "Узорны" калектывамі Лідскага раёна.

Адкрыў праграму ў Палацы культуры народны сямейны ансамбль акардэоннай музыкі "Круіз" (філіял "Мажэйкаўскі Дом культуры" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці").

Пад кіраўніцтвам Уладзіміра Віктаравіча Бачылы калектыў ізноў пацвердзіў свой высокі прафесіяналізм, падарыўшы гледачам і камісіі віртуознае выкананне і непаўторную атмасферу сямейнай творчасці.

Жадаем усім артыстам поспеху і новых творчых вяршыняў!






# Творчы экзаменацыйны марафон

А яшчэ сваё майстэрства прадставілі калектывы ўстаноў адукацыі:

Узорны ансамбль танца "Катрынка" СШ №15 г.Ліды (кіраўнік Шаньгіна Е.В.);

Узорны ансамбль танца "Вясёлая карусель" СШ №9 г. Ліды імя А.В. Нічыпорчыка (кіраўнік Кандраценка Р.Н.);

Узорны тэатр танца "Baby-Art" СШ №8 г. Ліды імя В.Ф. Казакова (кіраўнік Тампей Н.І.).






Акрамя названых у рамках праграмы на пацвярджанне звання "Узорны" чальцы камісіі таксама сказалі "Так!" творчым калектывам устаноў адукацыі:

Узорнай студыі сучаснага танца "База" Лідскага РЦТДІМ (кіраўнік Асядач-Брылеўская Е.К.);

Узорнаму акадэмічнаму хору "Anima" СШ № 4 г. Ліды (кіраўнік Тарасевіч З.М.),

Узорнаму аркестру народных інструментаў "Перазвон" СШ №4 г. Ліды (кіраўнік Кравец Д.О.);

Узорнай студыі эстраднай песні "Дамінанта" гімназіі №1 г. Ліды (кіраўнік Піваварчык Г.А.).

Узорны ансамбль танца "Сонейка" ДУ "Палац культуры горада Ліды", кіраўнік - Клышэвіч Кацярына Уладзіміраўна, асвятліў сцэну запальнымі рухамі і сонечнымі ўсмешкамі! Зала заззяла!









# Творчы экзаменацыйны марафон

Працягваем! Народны ансамбль габрэйскай музыкі "Шалом" ДУ "Палац культуры горада Ліды", кіраўнік - Дзвілянскі Міхаіл Якаўлевіч, скарыў аўтэнтычнымі мелодыямі, энергіяй і віртуознай ігрой на скрыпцы. Брава!







Завяршыў другі дзень выступаў на пацверджанне ганаровых найменняў легендарны калектыў - Народны ансамбль песні і танца "Лідчанка" ДУ "Палац культуры горада Ліды". Кіраўнік - Вольга Віктараўна Сяргеева.

Выступленне "Лідчанкі" стала магутным і гарманічным акордам дня. Калектыў, які з'яўляецца сапраўднай візітнай карткай нашага горада, ізноў прадэманстраваў бездакорны вакал, вывастраную харэаграфію і вернасць нацыянальным традыцыям. Майстэрства артыстаў і адданасць сваёй справе заслугоўваюць самых гучных авацый!







Віншуем усе калектывы з паспяховым праходжаннем гэтага важнага творчага выпрабавання!

*ТК "Культура Лідчыны".*

# "Забавушка" бярэ новыя вышыні

У Палацы культуры г. Ліды прайшла канцэртная праграма Узорнага ансамбля танца "Забавушка" ДУА "Лідская дзіцячая школа мастацтваў", прысвечаная прысваенню звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь"!

Канцэрт прайшоў на высокім узроўні, дзякуючы стараннай падрыхтоўцы, прафесіяналізму ўдзельнікаў і душэўнай атмасферы. Гледачы адзначылі яркія нумары, высокі ўзровень падрыхтоўкі, якія прыносілі станоўчыя эмоцыі.








Кіраўнікі Узорнага ансамбля танца "Забавушка" - Святлана Анатолеўна Паўлюкова, Наталля Аляксееўна Валюшкевіч, Ірына Віталеўна Бабарына, Дар'я Міхайлаўна Мармыш і Паліна Аляксандраўна Качарская.

Чакаем станоўчых вынікаў!

*ТК "Культура Лідчыны".*

# У Лідзе з'явілася алея блогераў

У канцы красавіка Ліда сустракала самых папулярных беларускіх блогераў. Перад пачаткам святкавання 1 Траўня ў рэгіёне праходзіла "Блогбай.Маёўка".










Ініцыятарам правядзення мерапрыемства выступала Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Гэта тэматычная падзея заклікана аб'яднаць лідараў думак, пазнаёміць гасцей з гісторыяй Лідчыны, а таксама ўнесці рэальны ўклад у развіццё і добраўпарадкаванне рэгіёна.

*ТК "Навіны Лідчыны".*

№ 18 (227) 6 ТРАЎНЯ 2026 г
наша СЛОВА.pdf

*Станіслаў Суднік*

# БЕЛАРУСКАЯ МЕТАЛІНГВІСТЫКА

## Колеры, афарбоўкі і масці ў Лідзе і ў астатняй Беларусі

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

### Афарбоўкі і масці жывёлаў

#### Пароды сабак



**Ёркшырскі тэр’ер**
3 - Тэр’еры, Вялікабрытанія



**Заходнесібірская лайка**
5 - Шпіцы і прымітыўныя пароды, Расія



**Ірландскі мягкапоўсцевы пшанічны тэр’ер**
3 - Тэр’еры, Ірландыя



**Жорсткапоўсцевы фокстэр’ер**
3 - Тэр’еры, Вялікабрытанія



**Ірландскі вадзяны спаніель**
8 - Рэтрыверы, спаніелі і вадзяныя сабакі, Ірландыя



**Ірландскі сетар**
7 - Выжлы, Ірландыя



**Залацісты рэтрывер**
8 - Рэтрыверы, спанііелі і вадзяныя сабакі, Вялікабрытанія



**Ірландскі ваўкадаў**
10 - Харты, Ірландыя



**Ісландскі сабака**
5 - Шпіцы і прымітыўныя пароды, Ісландыя



**Іспанскі алана (аланскі дог)**
Не прызнаны МКФ, Іспанія



**Іспанскі масціф**
2 - Пінчары і шнаўцары, малосы, горныя і швейцарскія быдлагонныя сабакі, Іспанія



**Каа де кастра-лабарэйра**
2 - Пінчары і шнаўцары, малосы, горныя і швейцарскія быдлагонныя сабакі, Партугалія



**Іспанскі вадзяны сабака**
8 - Рэтрыверы, спаніелі і вадзяныя сабакі, Іспанія (Андалусія)



**Істрыйскі ганчак**
6 - Ганчакі і сваяцкія пароды, Харватыя, Славенія



**Кавалер кінг чарльз спаніель**
8 - Рэтрыверы, спаніелі і вадзяныя сабакі, Вялікабрытанія



**Іспанскі гальга**
10 - Харты, Іспанія



**Італьянскі брак**
7 - Выжлы, Італія



**Ка-дэ-бо**
2 - Пінчары і шнаўцары, малосы, горныя і швейцарскія быдлагонныя сабакі, Іспанія



**Іспанскі ганчак**
6 - Ганчакі і сваяцкія пароды, Іспанія



**Італьянскі спіноне**
7 - Выжлы, Італія



**Кай-іну** ці **тыгровы сабака**
5 - Шпіцы і прымітыўныя пароды, Японія

*(Працяг у наступным нумары.)*



№ 18 (227) 6 ТРАЎНЯ 2026 г.
наша слова.pdf

# Станіслаў Баніфацый Юндзіл - праваднік новай батанікі на Беларусі

## (Даклад Станіслава Судніка на XIII Лідскіх чытаннях*)

**Даты жыцця Станіслава Баніфацыя Юндзіла:**

1761 - нарадзіўся ў Ясеньцах у Лідскім павеце, сын Бенедыкта Дунін-Юндзіла і Ружы з Даўгялаў;

1774 - пачатак вучобы ў школе піяраў у Лідзе;

1777 - пачатак паслушніцтва;

1779 - прынянцце пострыгу; пачатак настаўніцкай працы - Расены;

1781-1783-філасофскі факультэт у піярскай калегіі Вільні; курс хіміі ў Ю. Сарторыса;

1783 -тэалагічны факультэт;

1784 - Юндзіл атрымлівае пасвячэнне ў духоўны стан;

1785 - пачатак працы ў школе ў Шчучыне, стварэнне навучальнага батанічнага саду; пачатак фларыстычных даследванняў;

1787 - курс прыродазнаўства ў Г. Форстэра ў Віленскім універсітэце;

1790 - Ст. Б. Юндзіл пачынае лекцыі прыродазнаўства ў Піярскай калегіі ў Вільні (па-польску, а не на лацінскай мове);

1791 - выданне "Апісання дзікарослыхраслін у правінцыі ВКЛ паводле сістэмы Лінея"

1792 - Ст. Б. Юндзіл атрымлівае ад караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага медаль Merentibus;

1792-1797 - замежнае падарожжа;

1798 - доктарская дысертацыя па філасофіі; Юндзіл пачынае самастойныя лекцыі батанікі;

1799 - выданне "Ужытковай батанікі". Ст. Б. Юндзіл пераймае Батанічны сад у Ф. Спіцнагеля;

1801 -Ст. Б. Юндзіл становіцца членам Варшаўскага Таварыства Сяброў Навук;

1802 - Ст. Б. Юндзілу прысвойваюць званне прафесара батанікі і заалогіі ў Віленскім універсітэце;

1804-выданне "Асноў батанікі"',

1805 - Ст. Б. Юндзіл становіцца членам Маскоўскага Таварыства Аматараў Прыроды; выходзіць першы нумар "Віленскага кур'ера";

1807 - Ст. Б. Юндзіла выбіраюць прэфектам кандыдатаў на настаўніцкую пасаду; выдаецца "Кароткі нарыс заалогіі";

1811 - выдаецца "Апісанне літоўскіх раслін"', Юндзіл становіцца членам Гаспадарчага Таварыства ў Варшаве;

1824 - выхад на пенсію; Ст. Б. Юндзіл перадае легат на навучанне двух вучняў з прозвішчам Юндзіл у піярскай школе;



Stanisław Bonifacy Jundził

Станіслаў Баніфацый Юндзіл

1825 - перадача Батанічнага саду Юзафу Юндзілу;

1826 - падарожжа ў Карлсбад - наведванне Батанічнага і Памалагічнага саду ў Варшаве і Батанічнага саду ў Вроцлаве;

1827 - падарожжа ў Варшаву - знаёмства з Міхаілам Шубертам (дырэктарам варшаўскага Батанічнага саду);

1835 - падарожжа ў Карлсбад;

1847 - 12 кастрычнікаСт. Б. Юндзіл памірае ў Вільні. Пахаваны на Бернардзінскіх могілках.

*"Батаніка - гэта найпрыгажэйшая частка Натуральнай Гісторыі"*, - так пісаў у праграме лекцый

* Даклад падрыхтаваны паводле кнігі Ванды Грамбецкай "Станіслаў Баніфацый Юндзіл (1761 - 1847)". Варшава - Ліда. 2003, пераклад Кацярыны Канчэўскай і кнігі С. Б. Юндзіла "Успаміны майго жыцця". Наша слова.pdf, № 15 (224), 15 красавіка 2026 г., пераклад Леаніда Лаўрэша.


OPISANIE ROSLIN
W PROWINCYI W.X.L.
NATURALNIE ROSNĄCYCH
WEDŁUG UKŁADU
LINNEUSZA,
PRZEZ
X. B.S. JUNDZIŁŁA S.P.
w WILNIE 1791.
W Drukarni J.K. y Rzeplitey
u XX. PIAROW.

пра сваю галіну навукі, якой прысвяціў усё жыццё, Станіслаў Баніфацый Юндзіл, славуты сын Лідскай зямлі, прафесар Віленскага ўніверсітэта ў 1802-1824 гг. Менавіта ў роднай старонцы ён пачаў вывучаць батаніку. Пра гэтую навуку Юндзіл заўсёды - як у *"Дзённіку "*, так і ва ўступах да сваіх шматлікіх кніг - пісаў з захапленнем. Калі б Станіслаў Баніфацый ні быў на Лідчыне - ці вучнем, ці настаўнікам - ён заўсёды займаўся вывучэннем раслін і прысвечаных ім прац. Вынікам яго самастойнай адукацыі было *"Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі ВКЛ, зробленае паводле сістэмы Лінея Ксяндзом Б. С. Юндзілам "* - першая навуковая, прагрэсіўная (як на тыя часы) праца па флоры аднаго з рэгіёнаў Рэчы Паспалітай. Яна выйшла ў Вільні ў 1791 г. і адкрыла аўтару дарогу на ўніверсітэцкую кафедру.

Апрацоўка гэтай кнігі мела вялікае значэнне для польскай навукі. Напрыканцы XVIII ст. у Польшчы фарміруецца новая батаніка, а 1781-1791 гг. - гэта сапраўдны яе пералом, хуткае развіццё і далучэнне да еўрапейскай навукі. Вельмі значным з'яўляецца 1785 г., калі выходзіць першы польскі падручнік батанікі - *"Батаніка для нацыянальных школ"*, які напісаў Кшыштаф Клюк. Гэты дапаможнік быў створаны на роднай мове; аўтар выкарыстаў прыклады родных раслін, увёў польскую тэрміналогію. Адначасова, у тым жа годзе, Юндзіл закладвае першы школьны дыдактычны сад. Далейшае развіццё польскай навукі было звязана з узнікненнем літаратуры на роднай мове, а адным з піянераў гэтага працэсу быў менавіта Ст.Б. Юндзіл. Значэнне яго працы для нацыянальнай культуры адзначыў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, які ўзнагародзіў вучонага медалём MERENTIBUS. Пра тое, наколькі тая кніга Юндзіла была патрэбная, сведчыць і спіс падпісчыкаў, якіх было больш за сто; сярод іх былі вядомыя вучоныя і звычайныя землеўладальнікі, урачы, дамы, якія цікавіліся батанікай. "Апісанне..." з'яўлялася - як на свае часы - сучасным выданнем, яно хутка разышлося па свеце. Нават сёння, нягледзячы на тое, што кніга сталася рэдкасцю, можна знайсці яе ў шматлікіх бібліятэках Польшчы, а таксама за мяжой.

Станіслаў Баніфацый Юндзіл нарадзіўся ў Ясеньцах (Лідскі павет) у 1761 г. у Бенедыкта Дуніна-Юндзіла і Ружы з дому Даўгялаў. Гэта было асяроддзе дробнай шляхты. Дзяцеў у сям'і было шмат, і вельмі здольны хлопчык не меў шанцу атрымаць вышэйшую адукацыю, пра якую марыў. Толькі замілаванне да навукі і мудрая самаадукацыя дапамаглі яму набыць выдатную эрудыцыю і павагу ва ўніверсітэцкім асяроддзі. Аднак, пакуль гэта сталася, малады Юндзіл набываў веды спачатку дома, а потым (з 14-ці гадоў) у піярскіх школах Ліды, Шчучына і Любяшова.

З кнігі знакамітага прафесара біялогііі Станіслава Юндзіла: *"Успаміны майго жыцця"*:

*"Я нарадзіўся 6 траўня 1761 года ў Лідскім павеце, у Ясенцах, у бедным дзедзічным маёнтку майго бацькі, Бенедыкта Дуніна- Юндзіла. Я быў старэйшым сынам Ружы Даўгятлоўны, другой жонкі майго бацькі. Ад першага шлюбу з Квяткевічоўнай ён меў сыноў Шымона, Міхала і дачку Марцыяну, якая выйшла замуж за Насевіча. Мой малодшы брат Юзаф, памёр у дзяцінстве. Праз чатыры ці пяць гадоў пасля майго нараджэння я страціў маці, і мой бацька ажаніўся з Мартай Сангіноўнай, якая, пад разважлівым бацькоўскім наглядам, не стала для мяне мачыхай.*

*Беднасць маёнтка майго бацькі* (Такім чынам, Юндзіл не паходзіў з багатай сям'і, як пісаў Юзаф Бялінскі ў кнізе: Uniwersytet wilenski. T. III. S. 205.) *не дазволіла яму даць двум маім старэйшым братам належную адукацыю ў школах. Таму пазней, працай і намаганнямі, а таксама невялікім пасагам маёй маці, некалькі павялічыўшы сваё багацце, бацька больш клапаціўся пра маё выхаванне. На шостым ці сёмым годзе я пачаў вучыцца чытаць, пісаць і лічыць, а потым, праз настаўнікаў, якіх прывезлі ў маёнтак, пачаў вывучаць лацінскую граматыку па падручніку Альвара і чытаць у старых паперах стараруския* (стабеларускія - *Л. Л.*) *рукапісы. Калі ўжо крыху вывучыў лацінскую граматыку і меў ужо пэўны прагрэс у пісьме, бацьку здава-*

*лася, што адпраўка мяне з дому палегчыць маё далейшае выхаванне, а магчымасць практыкавацца ў эканамічных разліках і юрыдычных пытаннях забяспечыць маю будучыню.*

*Таму ў красавіку 1773 года ён перадаў мяне Казіміру Даўгялу, паўнамоцнаму камісару літоўскага стражніка Пацея, у Алькеніках. Даўгяла, хоць і меў адно прозвішча з маёй маці, не быў маім сваяком. Але з-за фінансавых даўгоў перад маім бацькам ён абяцаў арганізаваць для мяне вывучэнне вышэйзгаданых прадметаў. Гэта навучанне было нядоўгім - літоўскі стражнік Пацей памёр у тым жа годзе, мой настаўнік пакінуў службу, і восенню я вярнуўся дадому. Бацька не дазваляў мне доўга адпачываць дома. Увесь час прасіў мяне заняцца чымсьці карысным і хутка прыдумаў для мяне новую працу. У той час было прынята, каб чопавы падатак у павеце збіралі адмысловыя асобы, якіх называлі контр-агенты. Блізкі сусед, Ежы Хмялеўскі, атрымаў гэтую малавыгадную пасаду, і, паколькі ён сам не ўмеў пісаць, па просьбе бацькі ўзяў мяне памочнікам. Такім чынам, падарожнічаўшы амаль два месяцы з карчмы ў карчму, з мястэчка ў мястэчка, я змог убачыць увесь Лідскі павет уздоўж і ўпоперак і прывезці дадому некалькі заробку.*

*У 1774 годзе мой добры бацька, лічачы мае першыя юнацкія гады амаль дарэмна змарнаванымі і бачачы маё пастаяннае жаданне вучыцца, нарэшце, падштурхнуты маімі паўторнымі просьбамі, ахвяраваў сваімі старанна сабранымі грошамі і вырашыў ва ўзросце чатырнаццаць гадоў запісаць мяне ў школу піяраў у Лідзе. З самага пачатку майго знаходжання ў школе я заўважыў, наколькі карыснымі грунтоўнымі былі пачаткі лацінскай граматыкі, якія я атрымаў ад сваіх хатніх настаўнікаў. Я не толькі апынуўся на роўні амаль з усімі сваімі аднакласнікамі ў першым класе, але нават лёгка пераўзышоў многіх, так што адразу пасля першага года мяне перавялі ў другі клас, а ў наступным годзе я таксама прасунуўся, і лёгка быў пераведзены ў трэці клас* (у кожным класе вучыліся па два гады - *Л. Л.*). *Такім чынам, пасля першых двух гадоў я перастаў быць цяжарам для майго бацькі, бо, дзякуючы маім поспехам у вучобе і належнаму выкананню ўсіх абавязкаў, школьныя ўлады не толькі вызвалілі мяне ад утрымання наглядчыка нада мной, але праз некалькі месяцаў, нягледзячы на маладосць, я сам стаў хатнім наглядчыкам за іншым вучнем.*

*1777 год стаў больш важным і вырашальным у маім жыцці. У гэтым годзе, разважаючы, які далейшы і больш пэўны жыццёвы шлях я павінен абраць, без чыхнебудзь угавораў, падыходаў ці парадаў, памятаючы толькі пра выпадковыя прапановы майго бацькі шукаць сваю будучыню ў святарстве, яшчэ не маючы шаснаццаці гадоў, у красавіку я заявіў айцу Вольнеру, рэктару піяраў у Лідзе, што маю жаданне далучыцца да іх ордэна. Наколькі я памятаю, рэктар з разуменнем прыняў маю заяву, і хутка пасля гэтага, развітаўшыся з бацькам і сям'ёй, я адправіўся ў Шчучын, а адтуль неўзабаве, каб пачаць свой навіцыят, у Любяшаў. У тым жа годзе, у пачатку ліпеня, я апрануў манаскі строй піяраў.*

*Статут гэтай Кангрэгацыі прадугледжваў два гады навіцыяту, на працягу якіх я меў час падумаць, ці працягваць гэтую справу, ці адмовіцца ад яе. Я меў права вывучаць свае схільнасці …"*

Ст. Б. Юндзіл рана звязаў свой лёс з піярскім ордэнам, што тлумачыў перспектывай атрымаць адукацыю. У *"Дзённіку"* Юндзіл пісаў, што гэтае рашэнне дало яму магчымасць рэалізаваць планы навуковай працы ў Вільні. Час паказаў, што гэта быў правільны выбар. Парадак накіравання маладых адэптаў на працу ў школах дазваляў лепш пазнаваць многія мясціны і іх асяроддзі, сярод якіх некаторыя былі вельмі творчыя. Такім чынам, Станіслаў Баніфацый у 1777 годзе распачаў паслушніцтва, а ў 1779 г. прыняў пострыг з часовым вызваленнем ад захавання манаскага ўкладу ў сувязі з маладым узростам. З гэтага моманту ў яго жыцці перапляталіся перыяды настаўніцкай працы і вучобы. У ордэне ён атрымаў сярэднюю адукацыю падчас вучобы ва ўзгаданых вышэй школах Ліды, Шчучына і Любяшова. У 1781 быў накіраваны на двухгадовыя філасофскія ордэнскія курсы, а потым - на тэалагічныя (багаслоўскія). Аднак у 1781 г. у краіне адбываецца пералом у галіне адукацыі. У Вільні адчыняецца Галоўная школа Вялікага Княства Літоўскага (універсітэт), дзе паўстае кафедра прыродазнаўства. Выкарыстоўваючы кожную магчымасць, Станіслаў Б. Юндзіл слухае там лекцыі вядомых прафесараў і паглыбляе сваю адукацыю. Яго цікавяць батаніка, заалогія, хімія. З цягам часу ён набывае ў гэтых галінах трывалыя веды.

На Лідчыне Юндзіл знаходзіўся ў 1785-1789 гадах. Пасля настаўніцкай дзейнасці ў піярскай школе ў Расяніцах, куды яго накіравалі адразу пасля заканчэння вучобы ў Любяшове, а потым у Вільні, ён стаў настаўнікам у Шчучыне. Акрамя гэтага, кіраўніцтвам ордэна ён быў прызначаны гувернёрам у сям'ю Сцыпіёнаў - апекаваўся маладымі студэнтамі як у Шчучыне (падчас канікул), так і ў Віленскім універсітэце (у тыя часы такія патрабаванні мелі ўніверсітэцкія ўлады ў сувязі з маладым узростам навучэнцаў). Свае абавязкі ў доме Сцыпіёнаў Станіслаў Баніфацый цаніў высока, пра што прыгадвае ў *"Дзённіку"*. Ён пісаў, што культурнае асяроддзе магнацкага двара дазволіла яму набыць распазнанне ў этыкеце, пазбыцца правінцыяльнасці ў мове (пазбыцца беларусізмаў, якія напаўнялі польскую мову тутэйшай шляхты настолькі, што мову гэтую проста называлі "краёвай пальшчызнай", фактычна надаючы ёй статус дыялекту - *С.С.*) і авалодаць пэўнай смеласцю ў зносінах з высокапастаўленымі асобамі. Безумоўна, усё гэта спатрэбілася маладому вучонаму, калі лёс сутыкнуў яго з вядомымі людзьмі свайго часу. Падчас побыту ў гэтым невялікім мястэчку, якое акаляла прыгожая прырода, Станіслаў Баніфацый выконваў настаўніцкія абавязкі і займаўся батанікай.



Шчучын быў значным этапам на навуковай дарозе гэтага прыродазнаўцы, які тут, у глыбокай правінцыі, распачаў шлях да сваёй цудоўнай навуковай кар'еры, якая была ўвенчана універсітэцкай кафедрай і членствам у шматлікіх польскіх і замежных навуковых таварыствах. На гэтым прыкладзе можна ўбачыць, што шлях у вялікі свет можа весці нават з самага малога куточка, калі ёсць нешта годнае ўвагі для ахвяравання гэтаму свету. Скарбам, які Юндзіл перадаў сваім вучоным калегам, была прырода роднага краю, невядомая тагачасным батанікам, расліны, што раслі сярод палёў, лугоў і лясоў Лідчыны.

10 чэрвеня 1792 г. малады прыродазнаўца, выхаваны ў паўночнай краіне, прыехаў у Вену. Ён апынуўся ў навуковым цэнтры вялікай імперыі - Аўстрыі, у склад якой уваходзілі вельмі разнастайныя геаграфічныя краіны, а багатыя калекцыі, сабраныя ў гэтым горадзе, адлюстроўвалі не толькі разнастайнасць прыроды гэтага краю, але і дасягненні ў пазнанні свету еўрапейскімі вучонымі апошніх стагоддзяў. Гэта датычыла перадусім цудоўных паркаў, сярод якіх на першым месцы быў вядомы не толькі калекцыямі, але і батанічнымі традыцыямі парк у Шоэнбруне. У гэтым навуковым цэнтры былі таксама заалагічны і мінералагічны кабінеты. Венскія калекцыі, акрамя экзатычных экзэмпляраў, мелі шмат матэрыялаў з Аўстрыі, Венгрыі, Славакіі, Чэхіі і Галіцыі - з далін і гор. Усё гэта было адкрыта для Ст. Б. Юндзіла, які, не адкладваючы, знаёміўся з усім тым навуковым багаццем, якое Аўстрыя магла яму прапанаваць.

Мэтай, якую ён сабе паставіў, была ўсебаковая прыродазнаўчая адукацыя, якая б дапамагла яму ўзначаліць кафедру батанікі ў Віленскім універсітэце. Стыпендыю Камісіі Нацыянальнай Адукацыі Юндзіл атрымаў пасля доўгіх . намаганняў у Варшаве, мінаючы Вільню, адносіны з якой складваліся не найлепшым чынам. Побыт за мяжой, які павінен быў, як і іншыя навучальныя паездкі, доўжыцца 2-3 гады, зацягнуўся у сувязі з палітычнымі падзеямі. Яны працягнулі час побыту Юндзіла ў Аўстрыі і выклікалі фінансавыя праблемы. Аднак будучы віленскі прафесар, не пабаяўшыся гэтых цяжкасцяў, з энтузіязмам вывучаў усе раздзелы прыродазнаўства і стаў усебаковым эрудытам, атрымаўшы шмат практычных дасведчанняў, асабліва ў садоўніцтве, а таксама набыў важныя знаёмствы ў свеце навукі і сярод палякаў, якія былі ў той час у Вене. Гэтыя знаёмствы былі плённымі ўсё жыццё, а большасць пазнаных у той час суайчыннікаў дапамагала Юндзілу ў першы цяжкі перыяд працы ў Вільні.

У тыя цяжкія для сябе часы Станіслаў Баніфацый Юндзіл стаў знанай асобай у асяроддзі палякаў, якія ў той неспакойны час жылі ў Вене, а таксама пазнаёміўся з многімі вядомымі суайчыннікамі. Некаторыя, напрыклад, Гуга Калантай і Ігнацій Патоцкі, дапамагалі яму атрымаць адпаведныя дакументы, патрэбныя для падарожжаў, асабліва на прамысловыя аб'екты. Завязалася таксама бліжэйшае знаёмства з Ізабэлай Чартарыйскай, якой ён даваў урокі, бо гэтая апантаная садоўніца імкнулася паглыбіць свае веды ў батаніцы. Сяброўства і знаёмствы прадоўжыліся і пазней. Гэтыя людзі стараліся дапамагчы беларускаму батаніку ўладкаваць прафесійныя справы, прапануючы пасаду пробашча ў сваіх маёнтках. Прапаноўвалі яму працу і ў Вене. Аднак Юндзіл нястомна імкнуўся да вяртання ў Вільню, каб заняць доўгачаканую пасаду ва ўніверсітэце. Калі ён ужо ажыццявіў гэта, венскія знаёмыя дапамагалі яму ў найбольш цяжкія першыя гады арганізацыі працы ва ўніверсітэцкім батанічным садзе, падтрымліваючы новага прафесара насеннем і саджанцамі з сваіх садоў.

Станіслаў Баніфацый Юндзіл вярнуўся ў Вільню як усебакова адукаваны прыродазнаўца і апантаны фларыст. З цягам часу ён стаў вельмі добрым знаўцам сістэмы Лінея, якому застаўся верны ў сваіх працах і дзейнасці ў садзе, але перадусім - вельмі добрым знаўцам садоўніцтва, якому вучыўся на найлепшых прыкладах. Вучоба за мяжой папоўніла яго шматгадовую самаадукацыю і дазволіла атрымаць кваліфікацыі ва ўсіх галінах прыродазнаўства. Аднак далейшыя гады жыцця прысвяціў ён свайму замілаванню - навучанню батаніцы і батанічнаму саду Віленскага ўніверсітэта.

Станіслаў Баніфацый Юндзіл распачаў свае лекцыі батанікі ў 1798 г. яшчэ ў Галоўнай Літоўскай Школе -так пасля падзелу і далучэння гэтых зямель да Расійскай імперыі называлася Галоўная школа Вялікага Княства Літоўскага. Скончыў ён працу і перадаў кафедру свайму пераемніку ў 1823 г. У першым перыядзе вучоны працаваў як віцапрафесар, а кафедрай загадваў тагачасны папярэднік Ст. Б. Юндзіла - Фердынанд Спіцнагель. Самастойнасць Юндзіл атрымаў у 1802 годзе (асобны курс батанікі, у той жа час аддзялілі кафедру мінералогіі), а з 1803 года ён

быў прафесарам у рэфармаваным Аляксандрам I Віленскім універсітэце. Яго праца як выкладчыка доўжылася, такім чынам, 25 гадоў. Вывучэнне прыродазнаўчых навук было абавязковым як для будучых настаўнікаў, так і медыкаў. Таму не дзіўна, што ўсе вядомыя прыродазнаўцы ўніверсітэта былі вучнямі Юндзіла. З захаваўшыхся спісаў студэнтаў можна даведацца, як шмат меў ён слухачоў і як шмат выпускнікоў універсітэта мела ў сваіх студэнцкіх дакументах пасведчанне аб здадзеным экзамене з характэрным подпісам - X. Jundzill.

У сваім навучанні прафесар абапіраўся на лекцыі - што зразумела - і на працу ў батанічным садзе, які быў для яго як крыніцай экземпляраў для паказу падчас лекцый, так і асноўным месцам працы студэнта. Вучоны лічыў, што гэты сад павінен служыць выключна дыдактыцы, і таму на працягу ўсёй сваёй прафесарскай дзейнасці быў супраць праектаў навязвання ўніверсітэцкаму саду функцый гарадскога парку. Ён неаднаразова пісаў, што сад павінен служыць выключна "навучанню моладзі". Аднак, калі меркаваць па маляўніча апісаных у *"Дзённіку"* і працы *"Кабінет прыродазнаўства і батанічны сад Віленскага універсітэта"* прыгодах з самавольнымі наведвальнікамі, якія выкарыстоўвалі сваё грамадскае ці адміністрацыйнае становішча, гэта было цяжкай справай. Тыя людзі ставіліся да ўніверсітэцкага саду, як да крыніцы нелегальна набытых кветак і іншых раслін або месца не заўсёды культурных уцех. Шмат непакою і клопатаў прыносіла такая публіка Юндзілу, бо знішчала з цяжкасцю выгадаваныя калекцыі, а часам і ўнікальныя экземпляры, атрыманыя вялікімі намаганнямі ад замежных карэспандэнтаў. Аднак ён здолеў утрымаць сваю дыдактычную ўстанову - сад у належным стане і выкарыстоўваць яго выключна ў запланаваных ім мэтах.

Свае намеры, якія датычылі зместу і метадаў навучання, вучоны апублікаваў у выдадзеным універсітэтам спісе лекцый *"Prospektus lektionem"* на 1802/1803 акадэмічны год. З яго можна даведацца, што расклад заняткаў быў наступны: зімой выкладаліся тэарэтычныя часткі батанікі - перш за ўсё агульныя звесткі пра жыццё раслін (так званая фізіялогія раслін), правілы ўтварэння класіфікацыйных сістэм, якія выкарыстоўваліся ў тыя часы, і адпаведная тэрміналогія. Вясновыя і летнія месяцы прысвячаліся працы ў садзе і навакольных лясах і лугах. Такім чынам, студэнты вывучалі расліны з усяго свету, наколькі дазвалялі гэта калекцыі віленскага саду, а на экскурсіях (якія называліся тады гербарызацыямі) - мясцовыя расліны і набывалі практычныя ўменні іх распазнаваць і азначаць. Веданне асноў класіфікацыі Юндзіл лічыў вельмі важным для ўсіх прыродазнаўцаў. Неаднаразова ён прыводзіў прыклад вядомага сцвярджэння, што сістэма з'яўляецца пуцяводнай ніткай (ніткай Арыядны) батаніка ў яго падарожжы па бязмежным свеце раслін на зямным шары.

Яшчэ ў Вільні, а потым у Вене, ён вывучаў хімію, што дапамагло ў пазнанні навейшых навуковых дасягненняў у гэтай галіне і прадстаўленні на лекцыях апісання жыцця раслін наватарскім метадам з выкарыстаннем тэарэтычных набыткаў хіміі. Мог вучоны і сачыць за прагрэсам у гэтай галіне. На лекцыях фізіялогіі Юндзіл гаварыў пра харчаванне раслін, дыханне, іх рост і размнажэнне, уплыў глебы і святла на іх жыццё. Ён увёў таксама элементы ведаў пра хваробы раслін (сучасная фітапаталогія). Дарэчы, гэтым ён адрозніваўся ад сваіх вядомых папярэднікаў - кіраўнікоў кафедры прыродазнаўства ў Вільні - Жылібера і Форстэра. Такім чынам, прадстаўленая новым прафесарам праграма мела на ўвазе знаёмства з дасягненнямі хіміі. Віленскі студэнт пасля дакладнага азнаямлення (зімой) з ведамі пра жыццёраслін і авалодання тэрміналогіяй, а таксама спосабам карыстання сістэмай Лінея распачынаў практычныя заняткі ў садзе і на экскурсіях. Такі стыль навучання Юндзіл працягваў увесь час, мадэрнізуючы выключна яго змест.

Падчас загадвання кафедрай Станіслаў Баніфацый Юндзіл дасягаў ва ўніверсітэце чарговых навуковых ступеняў. Асабліва важным было атрыманне ў 1798 г. ступені доктара філасофіі, таму што гэта было абавязковай умовай для прафесарскага звання і дазваляла самастойныя лекцыі. У 1800 г. ён напісаў доктарскую працу па тэалогіі, што дазволіла яму атрымліваць розныя пасады ва універсітэце, нават тыя, якія не былі звязаны з яго кваліфікацыямі. На працягу ўсяго перыяду сваёй прафесарскай дзейнасці ён прымаў актыўны ўдзел у арганізацыйнай працы універсітэта. Неаднаразова рабіў даклады па навуковых пытаннях, рэцэнзіраваў праекты папаўнення калекцыі, быў членам шматлікіх камісій, дакладваў пра актуальныя праблемы на паседжаннях. Быў таксама і адным з заснавальнікаў, і актыўным аўтарам важнага перыёдыка *"Дзённік Віленскі"*, у якім надрукаваў шмат каштоўных артыкулаў, што датычылі розных біялагічных праблем. Паміж іншым, на старонках гэтага выдання ён выказваўся пра неабходнасць ведання батанікі рознага тыпу спецыялістамі (напр., *"Пра неабходнасць складанай наменклатуры ў прыродазнаўчых прадметах"*, Дзённік Віленскі, 1805). Станіслаў Баніфацый Юндзіл часта выконваў спецыяльныя заданні рэктара. Найбольш важнымі з іх былі экспертызы, якія датычылі пошуку мінеральнай сыравіны. Гэта было вельмі патрэбным для тагачаснай гаспадаркі. Паўночна-ўсходнія землі, якія апынуліся пад расійскім панаваннем, былі адрэзаны ад радовішчаў неабходнай сыравіны, паклады якой засталіся пад аўстрыяцкім панаваннем. Асабліва гэта датычыла солі, якую шукалі перадусім у салёных радовішчах, а таксама пакладаў матэрыялаў, што давалі энергію. Таму вывучалася кожнае данясенне аб магчымых пакладах торфу і салёных радовішчах. Універсітэт павінен быў праверыць верагоднасць такіх інфармацый, а таксама вызначыць магчымасці атрымання прадукту і від выкарыстанай тэхналогіі. Найважнейшай зробленай Юндзілам экспертызай было даследванне солі ў Стаклішках. Падарожжа ў гэтую мясцовасць адбылося ў 1792 г. Першым даследваў гэтыя радовішчы прафесар Віленскага ўніверсітэту Сарторыс - хімік, і Юндзіл быў перакананы, што адмоўнае меркаванне прафесара адносна

прыдатнасці іх да эксплуатацыі вядомымі спосабамі, напрыклад, згушчэннем праз пару, была слушнай. Аднак, Юндзіл паспрабаваў іншую тэхналогію, а менавіта - выкарыстанне для згушчвання раствору замарожанай салёнай вады і атрымаў такім чынам прадукт лепшай якасці. Ст. Б. Юндзіл правёў вельмі ўважлівыя даследванні, паўторна зрабіў аналіз хімічнага складу доследнай вады, апісаў свае эксперыменты і падрыхтаваў рапарт, які апублікаваў пасля як шырокую дысертацыю (*"Пра салёныя радовішчы і стакліскія солі"*, Вільня, 1792).

У тыя часы, калі Станіслаў Баніфацый Юндзіл распачынаў сваю прафесарскую дзейнасць, польская прыродазнаўчая, а значыць, і батанічная літаратура была вельмі беднай. Юндзіл слушна меркаваў, што гэта перашкаджае ў дыдактычнай працы і папулярызацыі батанікі ў грамадстве і таму лічыў сваім абавязкам узбагачэнне нацыянальнай літаратуры. Прафесар з'яўляўся аўтарам некалькіх значных выданняў, якія шмат гадоў служылі моладзі падручнікамі. У 1799 г. у Вільні выходзіць *“Ужытковая батаніка, або звесткі пра ўласцівасці і месца раслін у гандлі, эканоміцы, мануфактуры і іх радзіме, размнажэнні, утрыманні паводле сістэмы Лінея”*. Сама назва, як гэга здаралася ў выданнях васямнаццатага стагоддзя, ужо дастаткова паведамляла пра змест працы. Можна яшчэ дадаць, што аўтар - як ён сам піша ў *"Дзённіку "* - сабраў у ёй ўсе свае назіранні падчас замежнага падарожжа. Такім чынам, Юндзіл яшчэ ў пачатку сваёй прафесарскай дзейнасці быў аўтарам дзвюх важных кніг: *"Флоры літоўскай"* (або *"Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі ВКЛ паводле сістэмы Лінея"*) і прыгаданай вышэй *"Ужытковай батанікі"*. У пазнейшы час вучоны пачаў працу над наступным значным творам. Разважаючы над прыдатнасцю для дыдактычных мэтаў падручніка Кшыштафа Клюка, які, дарэчы, ён высока цаніў, прафесар канстатаваў, што на працягу тых 20 гадоў, якія прайшлі з часу выдання *"Батанікі для нацыянальных школ"* (Варшава, 1785 г.), у гэтай навуцы адбыліся такія значныя змены, што неабходна напісаць новы падручнік. Юндзіл сам заняўся гэтай справай, і ў 1804 г. у Варшаве выходзіць першы том новай кнігі, прызначанай для школ, пад назвай *"Асновы батанікі, 1 ч. Фізіялогія раслін"*, а 2 ч. - *"Навука тэрміналогіі"* (г. зн. шырокі слоўнік батанічных тэрмінаў) - была апублікавана ў 1805 г. Кніга была прыгожа ілюстравана, што рабіла больш лёгкім карыстанне слоўнікам тэрмінаў. Выданне гэтай працы папярэдзіла доўгая дыскусія ў асяроддзі віленскіх вучоных, не заўсёды прыхільная аўтару, але рэцэнзіі іншых польскіх батанікаў, асабліва вельмі прыхільная Францішка Шэйдта - кракаўскага, а потым крамянецкага прафесара- перахілілі шалі вагаў на карысць Юндзіла. Дарэчы, менавіта таму гэта кніга была надрукавана ў Варшаве, а не ў Вільні. *"Асновы батанікі "* мелі яшчэ другое выданне ў 1818 г., і яно было ў значнай ступені дапоўнена згодна з новымі навуковымі дадзенымі. Гэта датычыла перад усім частак пра фізіялогію раслін. Кніга амаль адразу пасля першага выдання была прызнана досыць цяжкай для вучняў і


ZOOLOGIIA
KRÓTKO ZEBRANA
CZĘSC TRZĘCIA
PŁAZY I RYBY.
PRZEZ
X. B. S. JUNDZIŁŁA
W IMPERATORSKIM WILEŃSKIM UNIWERSYTECIE BOTANIKI I ZOOLOGII PROFESSORA, TOWARZYSTWA WARSZAWSKIEGO PRZYJACIÓŁ NAUK I TOWARZYSTWA MOSKIEWSKIEGO NATURALISTÓW CZŁONKA.
W WILNIE
Drukiém Józefa Zawadzkiégo Imperatorskiégo Uniwersytetu Typografa.
1807.

залічана да ўніверсітэцкіх падручнікаў. Аднак з цягам часу ўзровень вывучэння батанікі ў школах узрастаў, і *"Асновы батанікі"* рэкамендавалі як падручнік для школ. Віленскі прафесар паклапаціўся таксама пра падрыхтоўку навуковага дапаможніка для студэнтаў і выдаў папраўленую і перапрацаваную на ключ да пазначання раслін сваю першую флору. Яна выйшла пад назвай *"Апісанне літоўскіх раслін паводле сістэмы Лінея"* ў 1811 г. у Вільні. Свае намеры аўтар прадставіў ва ўводзінах, дзе пісаў, што гэтае новае выданне літоўскай флоры мае на мэце зрабіць больш лёгкай навуку пра расліны ягоным вучням. Кніга шмат гадоў служыла польскім фларыстам у іх працы.

Ст. Б. Юндзіл шмат гадоў выкладаў і заалогію. Ён апрацаваў *"Кароткі нарыс заалогіі"* ў трох тамах (Вільня, 1807 г.), які таксама атрымаў шырокае прызнанне і доўгі час выкарыстоўваўся як падручнік, што рэкамендаваўся школам на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў XIX стагоддзя. Яго чацвёртае выданне выйшла ў 1829 г. Многія прыродазнаўцы лічылі, што ў гэтым дапаможніку змяшчаецца найлепшае тлумачэнне сістэмы Лінея з усіх зробленых на парозе XIX стагоддзя.

Кнігі Юндзіла былі папулярныя таксама і ў сувязі з прыгожай мовай, якой былі напісаны. Віленскі прафесар быў не толькі піянерам у стварэнні марфалагічнай тэрміналогіі раслін, што даказвала яго *"Навука тэрмінаў"*. Назаўсёды засталіся ў польскай мове і шматлікія відавыя назвы, ім утвораныя.

19 ліпеня 1799 г. Ст. Б. Юндзіл прыняў батанічны







Panorama ogrodu na Sorokiszkach
Панарама саду ў Саракішках



Panorama ogrodu około roku 1840
Панарама саду, каля 1840 г.

сад. Быў падпісаны адпаведны дакумент - *"Інвентар садовых прылад, аранжарэйных і грунтавых раслін у батанічным садзе Віленскай Акадэміі"* - і новы кіраўнік распачаў шматгадовую працу ў галіне, якую так моцна любіў і ў якой быў спецыялістам. Стан саду быў мізэрны. "Інвентар" паказвае аснашчэнне і калекцыі, якія не маглі забяспечыць вывучэння батанікі на ўніверсітэцкім узроўні. Дастаткова сказаць, што Юндзілу перадалі каля 400 відаў раслін. Што сталася з калекцыямі, прывезенымі ў Вільню Жыліберам, якія той збіраў у Гародні, дзе працаваў шмат гадоў? Яны змяшчалі не толькі сабраныя ім расліны, але і атрыманыя ад вядомых батанікаў-падарожнікаў, якія хацелі дапамагчы французскаму прыродазнаўцу, што накіроўваўся ў далёкую паўночную краіну, арганізаваць новы цэнтр батанічных даследванняў. Жылібер прывёз гарадзенскія калекцыі ў Вільню ў 1781 г. і размясціў часова на дзядзінцы Медычнага калегіюма (Collegium Medicum). У 1799 г. сад знаходзіўся на тым самым месцы, а тэрыторыя, якую ён займаў, паменшылася ў сувязі з размяшчэннем на дзядзінцы гаспадарчых пабудоў. Такое становішча адпавядала кіраўніцтву навучальнай установы, хаця ўжо другі прафесар прыродазнаўства - Форстэр - дамогся таго, каб універсітэт купіў новыя вялікія плошчы на тагачасным прадмесці Вільні - Саракішках. Ст.Б. Юндзіл пачынае практычна ад пачатку.

Калекцыя раслін хутка расла, што адлюстроўваюць лічбы. Як ужо прыгадвалася, на момант атрымання саду ў ім было каля 400 раслін, а ў 1802 г. - ужо 1072, у 1804 г. - 1526, у 1810 г. - 2400. Калі Юндзіл перадаваў сад свайму наступоўцы, колькасць відаў, якія вырошчваліся ў Батанічным садзе Віленскага універсітэта, дасягала ўжо 6500. Падабраныя паводле сістэмы Лінея, яны былі размешчаны як мага больш рацыянальна на прыгожай тэрыторыі ля Вілейкі. Гэтая тэрыторыя была яшчэ павялічана ў 1801 г. пляцоўкай, што межавала з ёю.




Ogród Botaniczny na planie Wilna ( ok. 1840 r.)

Батанічны сад на плане Вільні (каля 1840 г.)

Калекцыя, якую Юндзіл імкнуўся стварыць у Вільні, павінна была адпавядаць еўрапейскім стандартам. Ён пісаў у артыкуле "Пра знакамітыя расліны батанічнага саду " ("Дзённік Віленскі", 1815) пра неабходны склад калекцыі, які патрэбны, каб Віленскі батанічны сад адпавядаў навучанню на ўніверсітэцкім узроўні.

Гады напалеонскай кампаніі, калі войскі стаялі ў Вільні і частка саду была занята пад пашу, не моцна паўплывалі на знішчэнні ў калекцыі, тым больш, што не быў спынены звычайны ход абмену. Юндзіл адзначаў, што, нягледзячы на выкліканыя вайной хваляванні, абмен працягваўся і калекцыя папаўнялася. Сярод гадаваных раслін некаторыя былі асабліва цікавыя. Прывядзём некалькі прыкладаў. Юндзіл прыдбаў прывезены Банксам (славутым падарожнікам і дырэктарам саду ў К'ю пад Лонданам) гатунак *Strelizia reginae*. Гэты прыгожы куст, вядомы сёння паўсюль, безумоўна, упрыгожваў сад. Цікавая і прыгожая расліна *Cobea scandens*, якая была прывезена А. фон Гумбальдтам, таксама знаходзілася ў віленскай калекцыі. Юндзіл набыў і новазеландскі лён (*Phormium tenax*), акліматызаваны ў паўднёвай Еўропе. З Вены атрымалі калекцыі *Stapelli* - насякомаедных раслін з паўднёвай Афрыкі з цікавай біялогіяй, а з Крамянца - калекцыі вяргіняў і ружаў. Цікавая і ўзбагачаная тэрыторыя Батанічнага саду дазваляла маляўніча размясціць гэтыя каштоўныя калекцыі.

Надыходзіць 1825 год. Ст.Б. Юндзіл перадае Віленскі батанічны сад свайму наступоўцу па кафедры батанікі - Юзафу Юндзілу. У сувязі з гэтым прафесар выдае каталог *"Index Plantarum Horti Botanici caesareae Universitatis Vilnensis"*. Першы перыяд існавання саду ў Саракішках быў закрыты. Сад добра служыў навуцы ў Вільні, і многія пакаленні прыродазнаўцаў былі абавязаны яму добрай падрыхтоўкай да працы. Ён прынёс свайму стваральніку і трывалую памяць, і прызнанне батанікаў наступных пакаленняў.

Станіслаў Баніфацый Юндзіл памёр 12 кастрычніка 1847 г. у Вільні і быў пахаваны на Бернардзінскіх могілках. Яго сваяк - Юзаф Юндзіл - паставіў там помнік, на якім ёсць надпіс: *"Прыродазнаўства ў краіне пашыральнік, Батанічнага саду ў Вільні стваральнік"*. Гэты надмагільны помнік, адноўлены ў сувязі з гадавінай універсітэта, знаходзіцца ў добрым стане.

Такім чынам, сярод прозвішчаў славутых лідзян не можа не быць Станіслава Баніфацыя Юндзіла, сціплага піяра з Лідчыны, а адначасова - сумленнага даследчыка флоры родных старонак, аўтара кнігі *"Апісанне дзікарослых раслін правінцыі Вялікага Княства Літоўскага паводле*


ВИЛЕНСКІЙ ВѢСТНИКЪ
ОФФИЦІАЛЬНАЯ ГАЗЕТА
№ 30.
KURYER WILENSKI.
GAZETA URZĘDOWA.

Вильна. ПЯТНИЦА, 18-го Апрѣля. — 1847 — Wilno. PIĄTEK, 18-go Kwietnia.

Вильна.

15-го Апрѣля скончался здѣсь заслуженный Ординарный Профессоръ Натуральной Исторіи въ б. Императорскомъ Виленскомъ Университетѣ, Ксендзъ Бонифацій Станиславъ *Юндзиллъ*, на 86-мъ году отъ роду.

Wilno.

Dnia 15 Kwietnia b. r. umarł tu zasłużony Zwyczajny Professor Historyi Naturalnéj w b. Cesarskim Wileńskim Uniwersytecie, X. Bonifacy Stanisław *Jundziłł*, w wieku lat 86.





*сістэмы Лінея"*.

Трэба дадаць, што гэтая праца мела ў той час важнае навукова-пазнавальнае значэнне, уводзячы прыродазнаўцаў у свет "красовых" раслін, характэрных, паміж іншым, і для Лідчыны.

Другім важным звязаным з гэтым абшарам і значным для гэтайтэрыторыі дасягненнем Юндзіла было стварэнне ў 1785 годзе ў Шчучыне школьнага батанічнага саду, што стала пачаткам фларыстычнага даследвання вучонага піяра.

У 1993 г. адбылася першая навуковая выязная сесія Камітэта Гісторыі Навукі і Тэхнікі Польскай Акадэміі Навук на Лідчыну і Наваградчыну і першая пасля II Сусветнай вайны прэзентацыя польскай навуковай кнігі на гэтых тэрыторыях. Яна была арганізавана менавіта ў Шчучыне, звязаным асабліва цесна з дзейнасцю Станіслава Баніфацыя Юндзіла. Тады - падчас прэзентацыі кнігі, у якой знаходзіўся і вялікі тэкст, прысвечаны Юндзілу, - нарадзіўся цікавы праект: пры дапамозе лакальнага грамадства адбудаваць гэты гістарычны сад і вырошчваць у ім гэткія ж расліны, якія вырошчваў вучоны піяр -настаўнік канца XVIII стагоддзя.

Гістарычныя батанічныя сады існуюць зараз у розных еўрапейскіх краінах. У Польшчы, напрыклад, у Цеханоўцы, які знаходзіцца на Падляшшы, у Музеі Земляробства імя Кшыштафа Клюка адбудаваны сад лекавых раслін на падставе *"Расліннага слоўніка"* таго ж Кшыштафа Клюка - вядомага батаніка, заолага і мінералога XVIII стагоддзя. Гэты сад, у якім вырошчваюццатыя расліны, пра якія гаварылася ў клюкаўскім *"Слоўніку... "*, і ў якім адначасова на табліцах, змешчаных на загонах, даецца інфармацыя, якія хваробы гэтыя расліны лечаць, існуе ўжо шмат гадоў і карыстаецца асаблівай увагай наведвальнікаў.

Сутнасць праекту рэканструкцыі школьнага саду Станіслава Баніфацыя Юндзіла (гэты план зарадзіўся ў 1993 г. у Шчучыне) не магла абудзіць ніякай боязі, і гэта быў бы, магчыма, першы такога тыпу гістарычны сад на тэрыторыі Беларусі. Навуковую апеку над рэалізацыяй гэтай цікавай ідэі ўзяла на сябе дацэнт Ванда Грамбецкая. Трэба дадаць, што В. Грамбецкая знайшла на працягу некалькіх месяцаў у нейкім батанічным садзе Англіі патрэбнае насенне і саджанцы, якія адпавядаюць тым, што выкарыстоўваў Юндзіл. Нельга не прыгадаць пра асабліва важны факт: тагачасны мэр Шчучына хацеў прызначыць адпаведную тэрыторыю ў горадзе на рэканструкцыю школьнага батанічнага саду з XVIII стагоддзя. Ён меў разуменнек, што гэта было б карысным для рэпутацыі Шчучына. Прадстаўнікі гарадской грамадскасці, таксама прынялі гэты праект з воплескамі, але ён не быў рэалізаваны.

**Каментары:**

1. **Клюк Кшыштаф** (1739-1796) - надураліст, ксёндз, працы па батаніцы, заалогіі, мінералогіі і сельскай гаспадарцы. Напісаў першы польскі падручнік па батаніцы, зрабіў апісанне польскай флоры ("Dykcyonarz roslinny" (1786-88)).

2. **Панятоўскі Станіслаў Аўгуст** (1732-1798) - апошні кароль Рэчы Паспалітай (1764-95). Асоба неадназначная. Некаторыя лічаць яго разумным палітыкам, які дбаў пра культуру і адукацыю, пайшоў на рэформы і падтрымаў Канстытуцыю 3 Мая. Для іншых ён застаўся чалавекам без характару, які баяўся Расіі і ў рашучую хвіліну здрадзіў свайму краю.

3. **Піяры** (з лацінскага - айцы пабожных школ) мужчынскі ордэн, заснаваны ў 1597 ў Рыме. У Рэчы Паспалітай піяры з'явіліся ў 1642. У XVIII ст. зрабілі вельмі многа для рэформы асветы. На Лідчыне піяры дзейнічалі першапачаткова ў Балотным (Воранава), а потым - у Шчучыне і Лідзе. Пасля раздзелаў Польшчы дзейнасць ордэна на Лідчыне была забаронена. Сёння яны працягваюць сваю працу у Лідзе і Шчучыне.

4. **Сцыпіёны дэль Кампа**, шляхецкі род на Лідчыне. Сваю радаслоўную вялі ад двараніна каралевы Боны. Найбольш вядомыя старасты лідскія Ян (?-1738), які заснаваў піярскі калегіюм у Воранаве (1735), і Ігнацы (1728-1791 ), які перавёў калегіюм у Ліду.

5. **Камісія Нацыянальнай Адукацы**і, першая ўстанова па кіраўніцтву асветай ў Еўропе. Заснавана соймам Рэчы Паспалітай ў 1773-75. Ажыцявіла раформу школ і універсітэтаў у духу ідэй Асветніцтва. Галоўнае значэнне надавалася прадметам фізіка-матэматычнага цыклу, з гуманітарных навук выкладалася польская і лацінская граматыка, геаграфія, гісторыя і інш.

6. **Ламарк Жан Батыст Антуан** - французскі прыродазнаўца, стваральнік тэорыі развіцця жывога свету. Член французскай Акадэміі Навук. Напісаў навуковыя працы па эвалюцыі, распрацоўцы класіфікацыі раслін, палеанталогіі. Увёў падзел жывёл на пазваночных і беспазваночных, тэрмін "біялогія", апісаў шмат відаў арганізмаў.

7. **Ліней Карл**, шведскі прыродазнаўца, стваральнік сістэмы класіфікацыі расліннага і жывёльнага свету. Заснавальнік і першы прэзідэнт шведскай Каралеўскай АН (1739). Увёў двайную наменклатуру, паводле якой кожны від раслін і жывёл абазначаецца дзвюма лацінскімі назвамі - радавой і відавой. Стварыў класіфікацыю раслін і жывёл, вылучыў клас млекакормячых (да якога аднёс і чалавека).

8. **Жылібер Жан Эмануэль** натураліст, хірург і анатам, доктар медыцыны. У 1775-81 арганізаваў і кіраваў Гарадзенскай медыцынскай акадэміяй. Заснавальнік акушэрскай і ветэрынарнай школ у Гародні, клінічнага шпіталя (1775-81), батанічнага саду. У 1781-83 прафесар натуральнай гісторыі медыцынскага факультэта Галоўнай Школы ВКЛ, дзе заснаваў батанічны сад. Напісаў навуковыя працы па флоры Беларусі, Літвы і Польшчы.

9. **Шэйдт Францішак** (1759-1807) - хімік, фізік і батанік, прафесар Ягелонскага ўніверсітэта, ліцэя ў Крамянцы. Адзін з першых паслядоўрікаў Лавуаззе, аўтар

працы аб электрычнасці (*O elektrycznosci uwazanej w cialach ziemskich i atmosferze*, 1786)

10. **Лавуаззе Антуан** (1743-1794) - французскі хімік, адзін з заснавальнікаў сучаснай хіміі. Член Парыжскай АН (1772), член "Кампаніі водкупаў"; у час Вялікай Французскай рэвалюцыі пакараны смерцю паводле прыгавору трыбунала. Навуковыя працы Лавуаззе садзейнічалі ператварэнню хіміі ў навуку, заснаваную на дакладных вымярэннях. Даказаў складаны састаў паветра, растлумачыў ролю кіслароду ў працэсах гарэння і акіслення. Стварыў кіслародную тэорыю гарэння. Напісаў "Пачатковы падручнік хіміі" (1789).

11. **Вернэр Абрам Готліб** (1749-1817) - нямецкі геолаг і мінеролаг, прафесар горнай акадэміі ў Фрайбергу, лічыцца аснавапаложнікам геалогіі як самастойнай навукі.

12. **Калантай Гуга** (1750-1812) - палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, філосаф, педагог, публіцыст. Дзеяч Камісіі народнай адукацыі. Адзін з аўтараў Канстытуцыі 3 мая 1791. Адзін з кіраўнікоў паўстання 1794.

13. **Патоцкі Ігнацій** (1750-1809)- палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, асветнік. Адзін з галоўных дзеячаў Камісіі народнай адукацыі, узначальваў Таварыства элементарных кніг, суаўтар Канстытуцыі 3 мая 1791, быў адным з арганізатараў паўстання 1794.

14. **Чартарыйская Ізабэла** (1746-1835) - удзельніца і арганізатарка культурнага і літаратурнага жыцця, заснавальніца рэзідэнцыі ў Пулавах (аднаго з галоўных культурных асяродкаў Польшчы пасля 1800 г.), апалагетка народнай традыцыі. Займалася філантропскай і асветніцкай дзейнасцю сярод простага люду.

15. **Арыядна**, у грэчаскай міфалогіі дачка крыцкага цара Мінаса, якая дала афінскаму герою Тасею клубок нітак, з дапамогай якіх той выбраўся з лабірынта Мінатаўра (нітка Арыядны).

16. **Форстар Ежы Адам** (1754-1794) - прыродазнаўца і падарожнік, прафесар універсітэтаў Касэль і Вільні, падарожнічаў з Джэймсам Кукам вакол свету і Аляксандрам Гумбальдтам па Еўропе.

17 **"Дзённік Віленскі"** штомесячны навукова-літаратурны часопіс, які выдаваўся ў Вільні ў 1805-1806 і 1815-1830 гадах на польскай мове. Знаёміў чытачоў з дасягненнямі навукі, навінамі ў літаратуры, прапагандаваў новыя тэхналогіі. Тут друкаваліся гісторыкі Т. Нарбутт, І. Лялевель, М. Бялінскі, літаратары А. Міцкевіч, Т. Зан, А. Адынец і многія іншыя нашыя славутыя землякі.

18. **Юндзіл Юзаф** (1794-1877) - батанік, прафесар Віленскага ўніверсітэта, даследчык-фларыст, галоўная праца *"Opisanie roslin na Litwie, na Wolyniu, Podolu i Ukrainie dzikorosnacych jako i oswojonych"* (1830).

19. **Палас Пётр** (1741-1811) - прыродазнаўца, географ і падарожнік. Акадэмік Пецярбургскай АН (1767). Навуковыя працы па заалогіі, палеанталогіі, батаніцы, этнаграфіі. Адкрыў і апісаў шмат відаў млекакормячых, птушак, рыб, насякомых. Даследаваў выкапнёвыя. Аўтар прац *"Падарожжа па розных правінцыях Расійскай дзяр-жавы", "Флора Расіі".*

20. **Гумбальдт Аляксанд**р (1769-1859) - нямецкі географ, натураліст і падарожнік, ажыцявіў доследныя падарожжы па Паўночнай Амерыцы і Азіі. У працы *"Космас"* падсумаваў тагачасныя веды пра Сусвет і прыроду. Яго імем названы хрыбты ў Азіі і Амерыцы, гара на востраве Н. Каледонія, кратар на Месяцы, мінерал, некалькі раслін.

21. **Франк Юзаф** (1771-1842) - урач, з 1804 г. прафесар паталогіі, ў 1806-24 прафесар тэрапіі і кіраўнік клінікі Віленскага ўніверсітэта, адзін з заснавальнікаў Віленскага лекарскага таварыства (1805), з яго удзелам паўстаў Інстытут прывіўкі воспы ў Вільні (1808), заслужаны дыдактык.

22. **Баянус Людвік** (1776-1827) - урач і біёлаг. Прафесар Віленскага ўніверсітэта. Даў пачатак развіццю сучаснай ветэрынарнай навукі ў Польшчы, заснавальнік у 1823 г. першай ветэрынарнай школы пры Віленскім універсітэце.

23. **Снядэцкі Ян** (1756-1830) - брат Андрэя, матэматык, астраном і філосаф, прафесар Кракаўскай акадэміі і Віленскага ўніверсітэта, у 1807-15 рэктар. Арганізатар навуковага жыцця ў Польшчы, папулярызатар навукі, апрацаваў польскую матэматычную тэрміналогію. Працаваў у Камісіі народнай адукацыі. Адкрыў малую планету Паладу (1802).

24. **Снядэцкі Андрэй** (1768-1838) - брат Яна, хімік, урач, біёлаг і філосаф, прафесар хіміі і медыцыны Галоўнай Школы літоўскай, Віленскага ўніверсітэта і Медыка-хірургічнай акадэміі ў Вільні. Стварыў польскую хімічную тэрміналогію, аўтар першага польскага падручніка па хіміі (*Poczatki chemii*, 1800), увёў у навуковы аварот паняцце абмену рэчываў.

25. **Горскі Станіслаў** (1802-1864) - батанік-фларыст, медык, педагог. Скончыў Віленскі ўніверсітэт (1825). У 1829-32 загадчык батанічнага саду Віленскага ўніверсітэта, у 1832-42 ад'юнкт, прафесар Віленскай медычна-хірургічнай акадэміі. У 1842-47 жыў у Паставах, займаўся батанікай і энтамалогіяй. Адзін з першыхдаследчыкаўфлоры Белавежскай пушчы. Імем Горскага названы некаторыя віды раслін і насякомых.

26. **Бесер Вілібальд** (1784-1842) - польскі батанік-фларыст і ўрач, заслужаны для Крамянецкага ліцэя і яго батанічнага саду, пасля ліквідацыі ліцэя працаваў прафесарам батанікі Кіеўскага ўніверсітэта, даследваў раслінны свет Валыні, Падолля і Украіны. У 1809 г. выдаў першы сінтаз флоры Галіцыі (*Primitiae florae Galiciae*).

27. **Запаловіч Гуга** (1852-1817), батанік і падарожнік, з 1894 г. член Акадэміі Ведаў (суч. Акадэмія Навук), падчас кругасветнага навуковага падарожжа ў 1880-1890 гг. даследваў геалогію і флору Паўднёвай Амерыкі і Японіі, напісаў "*Krytyczny przeglad roslinnosci Galicji"* т. 1-3 1906-1911.





# У "Каробчыцах" пабудуюць сапраўдны “Стары горад” XIX стагоддзя

Пра гэта паведамілі на брыфінгу, які адбыўся ў агратурыстычным комплексе "Гарадзенскі маёнтак "Каробчыцы".

У жыхароў і гасцей вобласці з'явіцца магчымасць прагуляцца па вуліцы, дзе час спыніўся на мяжы XIX і XX стагоддзяў, наведаць адну з першых беларускіх друкарань, лячэбны кабінет і краму аптэкара. І гэта стане рэальнасцю!

На тэрыторыі АТК "Гарадзенскі маёнтак "Каробчыцы" ўжо вядуцца працы па будаўніцтве культурна-гістарычнага парку "Стары горад".





Што ж там з'явіцца?

- 10 гістарычных дамоў, якія адлюстроўваюць дух Гародні канца XIX - пачатку XX стагоддзя.
- Друкарня. Нагадаем, менавіта ў Гародні адкрылася адна з першых друкарань на тэрыторыі Беларусі, а "Газета Гарадзенская" стала першым перыядычным выданнем.
- Лячэбны кабінет і крама аптэкара. Бо менавіта ў Гародні была заснавана першая медыцынская акадэмія.
- Тры нацыянальныя хаткі, чыгуначны вакзал, палата мер і вагаў, рыцарская школа, гандлёвыя рады і пляц, фотаатэлье, банк, кінатэатр, карчма, этнаграфічны комплекс, новая ўваходная група і кавярня з дэгустацыяй страў беларускай кухні.





"Старыя горад" прапануе наведвальнікам разнастайны і насычаны вольны час, зробіць прастору прывабнай у любую пару года. Створыць атмасферу, якая падахвочвае вяртацца сюды зноў і зноў.

*ТК “Культура Лідчыны”.*

*Рэдактар Станіслаў Вацлававіч Суднік*

***Адрас рэдакцыі:***
231282, г. Ліда, вул. Лётная, 7а.
***Адрас для паштовых адпраўленняў:***
231282, г. Ліда-2, п/с 7.
***E-mail:*** sudnik@list.ru, sejlawiczy@gmail.com

Газета падпісана да друку 4.05.2026 г.

Фармат А-4.
Аб’ём 2,5 друкаванага аркуша.

***Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі. Рэдакцыя рукапісы не вяртае.***

**Газета размяшчаецца на сайтах: http://nslowa.by/; http://pawet.net/; http://belkiosk.by/**
*Дазваляецца самастойная раздрукоўка на паперу.*